**Талстая А.М.,**
*суіскальніца кафедры бібліяграфіі і дакументазнаўства*

# ДА АЗНАЧЭННЯ ПАНЯЦЦЯ "БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ КУЛЬТУРА"

Сучаснае дэмакратычнае грамадства — інфармацыйнае грамадства. Для таго каб эфектыўна, паспяхова жыць, працаваць у ім, неабходна мець доступ да сукупнасці карысных яму ведаў. Тым больш, што авалоданне інфармацыйнымі рэсурсамі на аснове сучаснай тэхнікі з'яўляецца важнейшым фактарам канкурэнтаздольнасці ва ўмовах сучаснага ўзроўню развіцця эканомікі. Вучоны М.Вашчэкін лічыць: "У галіне інфармацыйнага забеспячэння зараз адчуваецца рэзкае павелічэнне прадукцыйнасці працы дзякуючы інтэлектуалізацыі ўжытых сродкаў і павелічэнню паўнаты баз даных". Прафесар Вашынгтонскага універсітэта С.Кроўфорд лічыць, што паняцце інфармацыйнага грамадства адным з першых увёў у навуковы ўжытак амерыканскі эканаміст Ф.Махлуп. Услед за ім вучоныя П.Дракер, Д.Бэл, Э.Паркер і іншыя прапанавалі наступную схему перыядызацыі эканамічнай гісторыі:

— агракультурная эканоміка,
— індустрыяльная эканоміка,
— інфармацыйная эканоміка.

Некаторыя вучоныя, у тым ліку М.Урсул, прапануюць вызначаць ступень развіцця грамадства паводле інфармацыйнага зместу сацыяльных сістэм, па іх складанасці, упарадкаванасці, арганізацыі і структуры.

Як бачым, асноўнай тэмай сённяшняга развіцця грамадства з'яўляецца інфармацыя. Не апошнюю ролю выконваюць таксама інфармацыйныя рэсурсы і інфармацыйная культура. Аднак самая дасканалая сістэма інфармацыі не будзе працаваць, калі яе карыстальнікі не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

будуць мець уяўленне пра магчымасці гэтай сістэмы, ведаў, уменняў і навыкаў для работы з ёю. Іншымі словамі, калі яны не будуць мець інфармацыйнай культуры.

Культура ў агульным сэнсе гэтага слова, як і грамадска-эканамічныя фармацыі, цывілізацыі, уяўляе адну з агульных найбольш важных формаў чалавечай жыццядзейнасці. Дзейнасць чалавека — шматгранны працэс; такой жа шматграннай з'яўляецца культура. А яна ўключае мноства элементаў, сфер, напрамкаў, можа разглядацца ў розных ракурсах, у тым ліку і ў інфармацыйным.

У наш час няма агульнапрынятага азначэння паняцця "інфармацыйная культура". Многія аўтары (Г.Вараб'ёў, А.Яршоў, І.Маісееў) разглядаюць інфармацыйную культуру з пункту гледжання камп'ютэрызацыі. Другі накірунак у навуковым вызначэнні гэтага тэрміна— разгляд і вызначэнне ведаў, навыкаў інфармацыйнага пошуку. Сёння ў навуковай літаратуры гэтая з'ява разглядаецца больш глыбока. У некаторых працах, прысвечаных аналізу інфармацыйнай культуры, даследчыкі вылу-чаюць розныя яе ўзроўні:

— інфармацыйная культура грамадства,

— інфармацыйная культура сацыяльнай (дэмаграфічнай) групы,

— інфармацыйная культура асобы.

М.Дворкіна вызначае інфармацыйную культуру як сукупнасць ведаў, нормаў, правіл, каштоўнасцей, што створаны ў працэсе інфармацыйнай дзейнасці чалавека, адлюстроўваюць пэўны ўзровень яе развіцця. Гэта — азначэнне інфармацыйнай культуры грамадства. Робяцца спробы даць азначэнні, напоўніць паняцці інфармацыйнай культуры чалавека, некаторых прафесійных груп — бібліятэкараў, настаўнікаў і інш.

Н.Гендзіна падкрэслівае, што азначэнне інфармацыйнай культуры як асобнага, адносна самастойнага аспекта культуры стала магчымым у выніку станаўлення



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйнага падыходу да пазнання рэчаіснасці, развіцця ўяўленняў аб інфармацыйным грамадстве, у якім інфармацыйныя рэсурсы па сваёй значнасці стаяць на адным узроўні з энергетычнымі, фінансавымі і іншымі стратэгічнымі рэсурсамі, а інфармацыя разглядаецца як эканамічная катэгорыя, тавар, што выкарыстоўваецца для павышэння кваліфікацыі персаналу. Інфармацыйная культура адзначаецца і як адзін з фактараў адаптацыі сучаснага чалавека да ўмоў жыццядзейнасці.

Такім чынам, інфармацыйную культуру можна вызначыць як частку агульнай культуры чалавека і як адзін з элементаў агульнай структуры асобы.

Адной з састаўляючых інфармацыйнай культуры можна назваць бібліяграфічную культуру. Як адзначае М.Вохрышава, бібліяграфія ў кантэксце культуры, у кантэксце саўдзельніцтва ў развіцці культуры выступае ў якасці сродку фарміравання, захавання, пераемнасці культуры, культурных каштоўнасцей розных часоў і народаў. Так лічыць і В.Факееў, які сцвярджае: “Бібліяграфічная культура непасрэдна суадносіцца з базавым паняццем культуры, вызначае істотныя галіны жыццядзейнасці грамадства, чалавека, іх самарэалізацыі”. І.Маргенштэрн таксама адзначае, што інфармацыйная культура мае сваю бібліяграфічную састаўляючую. Такім чынам, можна зрабіць выснову: бібліяграфічная культура з'яўляецца часткай, падсістэмай інфармацыйнай агульначалавечай культуры.

Разглядаючы бібліяграфічную і інфармацыйную культуры на адным узроўні з культурамі інтэлектуальнай, палітычнай, эстэтычнай, маральнай, камунікатыўнай, мы можам гаварыць пра іх гістарычныя тыпы. Гісторыя бібліяграфіі пачынаецца з вынаходніцтва кнігадрукавання ў Еўропе. Раней існавала іншая форма інфармацыйнай культуры — рукапісная. Можна вылучыць тры перыяды развіцця бібліяграфічнай і інфармацыйнай культур у залежнасці ад спосабу распаўсюджвання ў іх інфармацыі

1. Рукапісны. Гэты перыяд адносіцца да эпохі старажытнага свету, вызначаецца наяўнасцю выхадных звестак, унутрытэкставых спасылак, развіццём рэтраспектыўнай нацыянальнай бібліяграфіі, выкарыстаннем алфавітнага размяшчэння запісаў.

2. Паліграфічны. Перыяд характарызуецца развіццём бібліяграфічнай перыёдыкі. З'яўляецца сістэма абавязковага экземпляра, ідзе развіццё кнігагандлевай, галіновай, тэматычнай бібліяграфій. З'яўляюцца картатэчныя і зводныя каталогі.

3. Электронны. Перыяд характарызуецца зліццём усіх відаў бібліяграфічнай інфармацыі ў банкі даных, развіццём інфармацыйных сетак. Бібліятэкі выяўляюцца ў якасці інфармацыйных школ. Характэрнай рысай перыяду з'яўляецца інфармацыйная свабода асобы.

Наша інфармацыйнае грамадства знаходзіцца ў стане пераходу ад другога да трэцяга перыядаў. Кожны чалавек у наш час павінен мець высокую бібліяграфічную культуру, рознабаковую інфармацыйную падрыхтоўку. Дзеля дасягнення такой мэты неабходная сістэма бесперапыннай адукацыі ў гэтым напрамку. Для правільнай арганізацыі працэсу выхавання бібліяграфічнай і інфармацыйнай культур трэба акрэсліць іх асноўныя кампаненты. Такія спробы зроблены Н.Агурцовай, М.Дворкінай, В.Факеевым.

Асноўнымі кампанентамі бібліяграфічнай культуры вызначаны:

1. Бібліяграфічныя веды пра існаванне, якасці, уласцівасці тэкстаў, пад якімі, у прыватнасці, В.Факееў разумее жывую і дакументальную памяць, электронныя інфармацыйныя сродкі, што з'яўляюцца духоўнымі каштоўнасцямі, патрэбнымі для паспяховай жыццядзейнасці, сацыялізацыі, фарміравання асобы, развіцця сутнасных сіл чалавека.

2. Бібліяграфічныя веды ў колькасці, неабходнай для хуткай, якаснай арыентацыі чалавека ва універсуме

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыі, а таксама бесперапыннае абнаўленне гэтых ведаў.

3. Веды, навыкі, уменні апрадмечвання культурных каштоўнасцей, стварэння бібліяграфічных знакавых сістэм, распрадмечвання бібліяграфічных ведаў, накіраваных на азнаямленне з духоўнымі багаццямі, якія захоўваюцца ў сацыяльнай бібліяграфічнай памяці; ператварэнне апошніх ва ўнутранае багацце асобы.

Гэтая структура ўсебакова ахоплівае і раскрывае паняцце бібліяграфічнай культуры і паказвае механізмы ўздзеяння працэсу фарміравання бібліяграфічнай культуры на ўдасканаленне, развіццё асобы ў розных напрамках. Тым больш што бібліяграфічная культура як частка інфармацыйнай, агульначалавечай культуры з'яўляецца сродкам актыўнага ўздзеяння на абуджэнне, фарміраванне, задавальненне духоўных патрабаванняў.

Дзякуючы бібліяграфічнай культуры чалавек мае магчымасць вырашыць праблему "ўпарадкавання свайго культурнага асяроддзя", правільна і эфектыўна зарыентавацца ў мностве тэкстаў. Можна гаварыць пра тое, што сістэма агульнай карціны свету дапаўняецца яшчэ адным кампанентам, "спецыяльнай навуковай карцінай свету тэкставых камунікацый"— бібліяграфічнай. Бібліяграфічная карціна свету з'яўляецца катэгорыяй, што яднае філасофскую, навуковую, рэлігійную карціны свету, дапамагае чалавеку развівацца ва ўсіх трох напрамках. Сучасны яе ўзровень, як адзначае В.Факееў, характарызуецца прызнаннем шматмернай структуры, у якой адлюстроўваюцца розныя тыпы культур, менталітэтаў, навуковых парадыгмаў у часе і прасторы. На практыцы гэта праяўляецца ў тым, што дапускаецца існаванне мноства бібліяграфічных інтэрпрэтацый тэкстаў, якія часам адмаўляюць адно аднаго, а таксама ў стварэнні сістэм тэкстаў, структурыраваных з розных сацыяльна-навуковых пазіцый, у залежнасці ад менталітэтаў стваральнікаў дакументальных тэкстаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У той час, калі інфармацыя ў грамадстве набывае ўсё большае значэнне, высокая інфармацыйная і бібліяграфічная культура з'яўляецца неабходнай умовай паспяховай вучобы, а потым працы. Школьнік, студэнт, спецыяліст павінны з мінімальнымі затратамі часу атрымліваць максімум карыснай і якаснай інфармацыі з шырокага патоку тэкстаў. Задача фарміравання высокай інфармацыйнай, бібліяграфічнай культуры можа быць паспяхова выраішана пры ўмове ўдзелу ў працэсе ўсіх звёнаў бесперапыннай адукацыі.

У апошнія гады праблема інфармацыйнага навучання атрымала асвятленне ў спецыяльным друку, на навуковых канферэнцыях па праблемах інфармацыйнай культуры. У Маскоўскім дзяржаўным універсітэце культуры, Беларускім універсітэце культуры, іншых ВНУ аналагічнага профілю ўведзены курс "Інфармацыйная культура асобы". Але варта адзначыць, што для выхавання сапраўды высокай інфармацыйнай і бібліяграфічнай культуры неабходна распрацаваць і стварыць цэлую сістэму бесперапыннага навучання ў гэтай галіне.

Пэўны вопыт азнаямлення з асноўнымі навыкамі інфармацыйнай дзейнасці ёсць у школах, у ВНУ. Гэта прапаганда бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў, знаёмства з навыкамі работы на камп'ютэры. На падставе набытага вопыту магчымы пераход да больш шырокага разгляду праблем выхавання бібліяграфічнай культуры з улікам сучасных патрабаванняў інфармацыйнага грамадства. Неабходна стварэнне паўнацэннай дыферэнцыраванай сістэмы бібліятэчнай адукацыі ў рэспубліцы.

Прынцыпы выхавання бібліяграфічнай культуры на розных этапах павінны грунтавацца на агульных прынцыпах пераемнасці звёнаў сістэмы "школа — вучылішча — ВНУ", прынцыпах узаемасувязі, размежавання функцый, тэарэтыка-тэматычнага адзінства, сістэмнасці. Кожны этап выхавання павінен даваць чалавеку аб'ём ведаў, што спатрэбіцца, будзе дастатковым у час усяго навучання, стане асновай для далейшага працягу вучобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вельмі важным у працэсе фарміравання бібліяграфічнай культуры, бібліяграфічнай адукацыі з'яўляецца развіццё пастаяннай цікавасці да інфармацыйнай, бібліяграфічнай дзейнасці, якая павінна стаць устойлівай цікавасцю асобы да падобнага віду дзейнасці. Гэта значыць, што інфармацыйная, бібліяграфічная культура некалі стане неад'емнай часткай культуры асобы, спосабам фарміравання светапогляду.

На заканчэнне неабходна зазначыць: запас інфармацыі ў грамадстве павялічваецца дзякуючы росту навуковых ведаў у выніку інтэлектуальнай дзейнасці людзей. Шырокае грамадскае і сацыяльнае выкарыстанне гэтай інфармацыі магчымае толькі пры наяўнасці развітой сістэмы інфармацыйнага забеспячэння і высокай інфармацыйнай, бібліяграфічнай культуры грамадства. Інфарматызацыя, фарміраванне інфармацыйнага грамадства патрабуюць вырашэння праблемы асваення культур новага тыпу — інфармацыйных. Гэтым і тлумачыцца, як адзначае В.Факееў, з'яўленне паняццяў "інфармацыйная культура", "бібліяграфічная культура".

На падставе распрацовак дадзенай тэмы шэрагам даследчыкаў можна адзначыць: бібліяграфічная культура мае важнае значэнне для развіцця грамадства, асобы. Яна адлюстроўвае пэўны ўзровень развіцця чалавека, грамадства ў галіне бібліяграфіі. Ён выяўляецца ў валоданні навыкамі, уменнямі бібліяграфічнай дзейнасці, у спосабе арганізацыі вучэбнай, вытворчай, навуковай, самаадукацыйнай, пазнавальнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ